ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 134

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

(павышаны ўзровень)

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння на павышаным узроўні вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» ў X–XI класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана:

на X клас – 102 вучэбныя гадзіны (3 гадзіны на тыдзень);

XI клас – 102 вучэбныя гадзіны (3 гадзіны на тыдзень).

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

4. Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура»:

фарміраванне ў вучняў ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць самастойнае засваенне мастацка-эстэтычных, духоўна-маральных каштоўнасцей;

фарміраванне літаратурнай кампетэнцыі – сістэматызацыя ведаў пра літаратуру як цэласнасць, прадстаўленую ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзейнасці;

фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі, развіццё ўяўленняў пра літаратуру як сацыякультурны феномен;

фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, якая раскрывае камунікатыўную прыроду тэксту, дзе наладжаны дыялог паміж героямі, аўтарам і чытачом, адзінкавым тэкстам і мноствам кантэкстаў;

фарміраванне культуратворчай кампетэнцыі – сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, гэта значыць, навучанне дзейнасці праз уключэнне ў гэту дзейнасць.

5. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання і выхавання: семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і іншыя метады і прыёмы. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад, пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры

на асобу вучня. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з’яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейсны характар, дыялагічнасць.

Мэтазгодна спалучаць франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

Асноўныя віды дзейнасці: аргументаванне ўласных ацэнак дзеянняў і ўчынкаў герояў і падзей; асэнсаванае чытанне мастацкіх, навукова-папулярных і публіцыстычных тэкстаў; характарыстыка (індывідуальная, параўнальная, групавая) герояў твора; складанне плана ўласнага выказвання; напісанне сачыненняў розных відаў па вывучаных творах; разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя, адказ на праблемнае пытанне; вуснае слоўнае маляванне; напісанне водгуку на самастойна прачытаны літаратурны твор, твор выяўленчага мастацтва, кінафільм або тэлеперадачу; пераказ (выбарачны, падрабязны, творчы) эпічнага твора ці ўрыўка з яго; выкананне творчых заданняў; выразнае чытанне мастацкіх твораў розных жанраў; даклад, паведамленне, рэферат на літаратурную тэму па адной ці некалькіх крыніцах; каменціраванне мастацкага тэксту; мастацкае расказванне; назіранне за мовай і асаблівасцямі будовы мастацкага твора; напісанне ўласных твораў (вершаў, казак, загадак, невялікіх апавяданняў, мастацкіх замалёвак, эсэ і падобных твораў); падрыхтоўка вуснага выказвання; рэцэнзія на самастойна прачытаную кнігу, прагледжаныя кінафільм, тэлеперадачу, спектакль, твор жывапісу або музыкі; складанне тэзісаў, канспекта паводле

літаратурна-крытычнага артыкула або лекцыі педагагічнага работніка; складанне бібліяграфіі па тэме, прапанаванай педагагічным работнікам; складанне плана (у тым ліку цытатнага) твора ці ўрыўка з яго; стварэнне ілюстрацый да літаратурнага твора і іх прэзентацыя; супастаўленне літаратурнага твора з яго інтэрпрэтацыяй у іншых відах мастацтва; супастаўленне мастацкіх твораў розных аўтараў; устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурнага твора з творамі іншых відаў мастацтва; чытанне і паўнавартаснае ўспрыманне мастацкіх твораў.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, педагагічны работнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе <1>.

Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца з улікам выбару педагагічнага работніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Асобных урокаў на вывучэнне тэорыі літаратуры не адводзіцца. Праца па фарміраванні тэарэтычных паняццяў павінна праводзіцца ва ўзаемасувязі з вывучэннем канкрэтных мастацкіх твораў або перыядаў развіцця літаратуры.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, у тым ліку на навучальныя і кантрольныя сачыненні, педагагічны работнік размяркоўвае ў адпаведнасці з каляндарна-тэматычным планаваннем.

--------------------------------

<1> Творы, прапанаваныя ў спісе для дадатковага чытання, можна знайсці ў кнігах серыі «Школьная бібліятэка», якія знаходзяцца ў бібліятэчным фондзе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

6. Вынікам дасягнення мэт і задач літаратурнай адукацыі становяцца прадметныя кампетэнцыі: літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, моўленчая, камунікатыўная, культуралагічная і культуратворчая.

Вынікам фарміравання літаратурнай кампетэнцыі з’яўляецца засваенне вучнямі ведаў пра літаратуру як сістэму, сфарміраваных у выглядзе паняццяў і рэалізаваных у разнастайных спосабах дзейнасці.

Вынікам фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі павінна стаць агульная сістэма духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый, нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, гуманістычнага погляду на свет, павага вучняў да агульначалавечых каштоўнасцей.

Вынікам фарміравання моўленчай і камунікатыўнай кампетэнцый павінна стаць паспяховае ажыццяўленне вучнем моўленча-камунікатыўнай дзейнасці, калі вучань з’яўляецца суб’ектам дзейнасці і зносін.

Вынікам фарміравання ў вучняў культуралагічнай кампетэнцыі

павінна стаць усведамленне вучнямі літаратуры як феномена культуры, асэнсаванне імі нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай літаратуры ў адзінстве з сусветнай мастацкай культурай.

Вынікам рэалізацыі культуратворчай кампетэнцыі ў навучанні літаратуры з’яўляецца авалоданне не асобнымі базавымі ведамі, літаратурна-творчымі ўменнямі і навыкамі, а сістэмай цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, гэта значыць, навучанне ў дзейнасці праз уключэнне ў гэту дзейнасць.

Асобасныя вынікі засваення зместу адукацыйнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» адлюстроўваюць асаблівасці развіцця асобы вучня і выяўляюцца ў тым, што вучань: праяўляе імкненне да фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый і выкарыстоўвае іх у сваёй дзейнасці; валодае нацыянальнай самасвядомасцю, пачуццём патрыятызму; прымае каштоўнасці сямейнага жыцця і праяўляе адказнасць за сям’ю; праяўляе талерантнасць, гатоўнасць і здольнасць да ўзаемаразумення, дыялогу і супрацоўніцтва; кіруецца ў сваіх паводзінах прынятымі ў грамадстве маральнымі нормамі і агульначалавечымі каштоўнасцямі; дэманструе эстэтычнае стаўленне да свету, усіх сфер жыццядзейнасці грамадства; адчувае патрэбу ў самарэалізацыі і самаўдасканаленні; праяўляе эмацыянальную сталасць.

Метапрадметныя вынікі асваення адукацыйнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» адлюстроўваюць гатоўнасць вучня да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, асваення ўніверсальных вучэбных дзеянняў і міжпрадметных паняццяў і выяўляюцца ў тым, што вучань: ажыццяўляе вучэбную дзейнасць на аснове сфарміраваных агульнавучэбных уменняў і навыкаў; устанаўлівае міжпрадметныя сувязі; валодае лагічнымі аперацыямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі па рода-відавых прыкметах, устанаўлення аналогій і прычынна-выніковых сувязяў паміж фактамі і з’явамі, вызначэння паняццяў, мадэлявання, доказу і абвяржэння; валодае навыкамі розных відаў вучэбна-практычнай дзейнасці; здольны ўспрымаць і тлумачыць на аснове атрыманых ведаў і вопыту з’явы і падзеі паўсядзённага жыцця; ажыццяўляе самастойны пошук рацыянальных спосабаў рашэння практычных задач; умее ўзаемадзейнічаць у розных відах сумеснай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; умее весці дыялог, вырашаць праблемныя сітуацыі; прытрымліваецца этычных і маральных норм зносін і супрацоўніцтва; умее правільна, лаканічна і лагічна выкладаць свой пункт гледжання; можа аргументаваць уласную пазіцыю; крытычна ставіцца да свайго і чужога меркавання; самастойна арыентуецца ў розных крыніцах інфармацыі; крытычна ўспрымае інфармацыю, атрыманую з розных крыніц, пісьменна інтэрпрэтуе і выкарыстоўвае яе ў адукацыйных і агульнакультурных мэтах; ажыццяўляе самастойны пошук метадаў

вырашэння праблемных задач творчага характару; самастойна арганізуе сваю дзейнасць, плануе ўласнае інтэлектуальнае развіццё, прагназуе навучальныя дасягненні; умее вызначаць мэты свайго навучання, ставіць і фармуляваць новыя задачы ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; суадносіць свае дзеянні з запланаванымі вынікамі, ажыццяўляе кантроль сваёй дзейнасці ў працэсе дасягнення мэты, выбірае найбольш эфектыўныя шляхі іх рэалізацыі, карэкціруе свае дзеянні ў адпаведнасці з сітуацыяй, якая змяняецца; праяўляе здольнасць да самакіравання вучэбнай дзейнасцю, рэфлексіі, самарэгуляцыі, самастойнага вызначэння прыярытэтных задач; матываваны на інавацыйную, стваральную дзейнасць.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### X клас

Усяго 102 гадзіны:
на вывучэнне твораў – 87 гадзін;
на навучальныя сачыненні – 4 гадзіны;
на кантрольнае сачыненне – 8 гадзін;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 2 гадзіны;
рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна.

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Літаратура – спецыфічная форма пазнання жыцця народа, выяўлення яго мастацкага спосабу мыслення. Канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў мастацтве слова. «Вечныя вобразы» ў літаратуры. Асноўныя напрамкі, стылі і жанры мастацкай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Літаратурны напрамак.

### ДАЎНЯЯ ЛІТАРАТУРА (XI–XVIII стст.) (7 гадзін)

Літаратура эпохі Сярэдневякоўя (1 гадзіна). Агульная характарыстыка літаратуры Сярэдневякоўя (з абагульненнем раней вывучанага). Пачатковы перыяд развіцця славянскай пісьменнасці (XI–XII стст.); тэматычная і жанравая разнастайнасць перакладной і арыгінальнай літаратуры.

Кірыл Тураўскі. Словы. Казанні. Павучанні. Жыццё і літаратурна-асветніцкая дзейнасць К.Тураўскага. Пропаведзь маральнага ўдасканалення чалавека і грамадства, крытыка чалавечых заганаў. Высокае паэтычнае майстэрства К.Тураўскага (метафарызм, красамоўства, багацце

лексікі) (1 гадзіна).

Тэорыя літаратуры. Жанры літаратуры Сярэдневякоўя: жыціе, летапіс, прадмова (паглыбленне паняццяў), хаджэнне, пропаведзь, слова (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Скульптура: помнік Кірылу Тураўскаму (Тураў. Скульптар М.Інькоў, архітэктар М.Лук’янчык); М.Інькоў. «Кірыла Тураўскі»; І.Пратасеня. «Кірыла Тураўскі».

Літаратура эпохі Адраджэння (1 гадзіна). Агульная характарыстыка літаратуры эпохі Адраджэння (XVI ст.) (з абагульненнем раней вывучанага). Пашырэнне гуманістычнага светаўспрымання і светаадчування. Чалавек як мера каштоўнаснага і прыгожага ў мастацтве. Эпоха Адраджэння ў Беларусі.

Францыск Скарына. Прадмова да ўсёй Бібліі, прадмова да Псалтыра і кнігі Іова (урыўкі) (1 гадзіна). Ф.Скарына – першадрукар і асветнік (з абагульненнем раней вывучанага). Пераклад і выданне кніг Бібліі. Імкненне Ф.Скарыны наблізіць кнігу да народа (старабеларуская мова, прадмовы, тлумачэнні). Вершатворчасць Ф.Скарыны. Найважнейшыя рысы рэнесанснага гуманізму ў творчасці Ф.Скарыны. Вольная і ўсебакова развітая асоба як ідэал эпохі. Агульначалавечы змест прадмовы да кнігі Іова. Значэнне дзейнасці Ф.Скарыны.

Развіццё беларускага кнігадрукавання (1 гадзіна). С.Будны і В.Цяпінскі як прадаўжальнікі справы Ф.Скарыны. Патрыятычны і грамадзянскі пафас прадмоў да «Катэхізіса» і «Евангелля».

Тэорыя літаратуры. Жанры літаратуры Адраджэння: прадмова (паглыбленне паняцця), пасляслоўе (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Скульптура: З.Азгур. «Францыск Скарына»; А.Глебаў. Помнік Ф.Скарыну ў Полацку; помнік С.Буднаму ў Нясвіжы (скульптар С.Гарбунова, архітэктар Ю.Казакоў); А.Шатэрнік. «Мікола Гусоўскі». Жывапіс: І.Ахрэмчык. «Францыск Скарына»; Г.Вашчанка. «Роднае слова. Францыск Скарына»; Л.Шчамялёў. «Францыск Скарына. Вяртанне». Музыка: Д.Смольскі. Опера «Францыск Скарына». Кінамастацтва: «Я, Францыск Скарына» (рэжысёр Б.Сцяпанаў).

Літаратура эпохі Барока (1 гадзіна). Агульная характарыстыка літаратуры барока (XVII–XVIII стст.). Асаблівасці беларускага барока, яго праявы ў літаратуры і іншых відах мастацтва. Палітычная сатыра і гісторыка-мемуарная проза («Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча»). Вершатворчасць на беларускай мове (Сімяон Полацкі). Станаўленне беларускага тэатра (батлейка, школьная драма і інтэрмедыя).

Літаратура эпохі Асветніцтва (1 гадзіна). Агульная характарыстыка літаратуры Асветніцтва (другая палова XVIII – пачатак XIX ст.) Рысы Асветніцтва ў беларускай літаратуры. Развіццё паэзіі і драматургіі.

Мастацтва. Архітэктура: Мірскі замак; Нясвіжскі палац. Жывапіс:

партрэты Юрыя Радзівіла (XVI ст.), Януша Радзівіла (XVII ст.), Ежы Радзівіла (XVII ст.). Музыка: М.Агінскі. Паланэз «Развітанне з Радзімай». Кінамастацтва: «Ветрык арэляў» (рэжысёр С.Гайдук); «Паланэз Агінскага» (рэжысёр Л.Голуб).

## РАЗВІЦЦЁ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТ. (8 гадзін)

Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст. (1 гадзіна). Асноўныя фактары станаўлення новай беларускай літаратуры (цікавасць да фальклору, народнага побыту, гістарычнага мінулага і традыцый). Пераважна ананімны характар бытавання твораў. Узнікненне камічных, бурлескных твораў (паэмы «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»). Дзейнасць студэнцкіх таварыстваў Віленскага ўніверсітэта.

Рамантызм у еўрапейскім і беларускім мастацтве слова канца XVIII – першай паловы XIX ст. як вядучы літаратурны напрамак (з абагульненнем раней вывучанага) (1 гадзіна). Перадумовы ўзнікнення рамантызму. Пошукі ідэалу ў мінулым, мастацкіх уяўленнях пра будучыню, апісаннях экзатычных зямель. Асаблівая ўвага да індывідуальнага свету чалавека Роля А.Міцкевіча ў развіцці рамантызму на тэрыторыі Беларусі.

Ян Чачот. Вершы «Покуль сонца ўзыдзе...», «Да мілых мужычкоў», «На прыезд Адама Міцкевіча» (1 гадзіна). Звесткі пра жыццё і творчасць. Беларускамоўная творчасць. Маральна-этычная і сацыяльная праблематыка твораў Я.Чачота. Уплыў творчасці Я. Чачота на А.Міцкевіча.

Тэорыя літаратуры. Рамантызм як літаратурны напрамак.

Мастацтва. Архітэктура: палац у Снове (XIX ст.); сядзіба Ваньковічаў у Мінску (XIX ст.). Скульптура: В.Янушкевіч. Помнік Адаму Міцкевічу ў Навагрудку. Жывапіс: У.Пракапцоў. «А.Міцкевіч. Боль паэта»; Р.Вільчынскі «Ян Чачот».

Францішак Багушэвіч. Паэма «Кепска будзе!», апавяданне «Тралялёначка» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці ў паэме «Кепска будзе!». Паказ жыццястойкасці беларускага народа. Роля айчыма ў лёсе Аліндаркі. Матыў трагічнасці і безвыходнасці. Стварэнне вобраза парэформеннай Беларусі ў апавяданні «Тралялёначка». Вобраз Бартка Саска.

Тэорыя літаратуры. Рэалізм як літаратурны напрамак.

Мастацтва. Скульптура: З.Азгур. Помнік Францішку Багушэвічу (Жупраны); К.Асадаў. «Францішак Багушэвіч» (скульптурны барэльеф). Жывапіс: Я.Ціхановіч. «Партрэт Францішка Багушэвіча».

Янка Лучына. Верш «Роднай старонцы»; паэма «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» (ва ўрыўках) (1 гадзіна). Звесткі пра жыццё і творчасць. Тэма радзімы ў лірыцы Янкі Лучыны. «Паляўнічыя акварэлькі з

Палесся». Чалавек і прырода – галоўная тэма твора. Паказ беларускага народнага характару сродкамі эпічнай паэзіі ў «Паляўнічых акварэльках з Палесся». Вобраз Грышкі. Гуманістычны пафас твора. Лучына-пейзажыст. Пераклічка з «Запіскамі паляўнічага» І.С.Тургенева. Янка Лучына і Уладзіслаў Сыракомля. Якуб Колас і Максім Багдановіч пра Янку Лучыну.

Тарас Шаўчэнка. Вершы «Думка» («Цяжка-цяжка жыць на свеце...»), «Садок вішнёвы каля хаты...» (1 гадзіна). Т.Шаўчэнка і Беларусь. Грамадзянскасць паэзіі Т.Шаўчэнкі. Патрыятычны пафас, боль за лёс роднай зямлі. Сувязь з фальклорам, песеннай творчасцю ўкраінскага народа.

Мастацтва. Скульптура: В. Ліпаўка. Помнік Т. Шаўчэнку ў Мінску. Музыка: А.Багатыроў. Змяшаны хор без суправаджэння «Сонца заходзіць»; цыкл рамансаў для голасу з фартэпіяна «Пастаўлю хату», «І шырокую даліну», «Агні гараць», «Ад сяла да сяла» (з паэмы «Гайдамакі»), «Вішнёвы садок каля дома».

## ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ. (70 гадзіны)

Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя (1 гадзіна). Агульная характарыстыка беларускай літаратуры пачатку XX ст. Роля газет «Наша доля», «Наша ніва» ў гісторыі айчыннай культуры і мастацтва слова. Фарміраванне класічных асноў беларускай літаратуры. Праявы мадэрнізму ў беларускай літаратуры. Прыход у літаратуру Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага, Вацлава Ластоўскага, Каруся Каганца, Ядвігіна Ш. і іншых аўтараў. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Дыскусія на старонках газеты «Наша ніва» ў 1913 годзе пра шляхі развіцця беларускай літаратуры.

Цётка. Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора», апавяданне «Асеннія лісты» (2 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Патрыятычны змест лірыкі Цёткі, паэтызацыя непаўторнасці і хараства Бацькаўшчыны. Асноўныя матывы і пафас вершаў, іх рамантычна-сімвалічная вобразнасць. Яскравасць паэтычнага стылю: рытміка, інтанацыя, гукапіс, тропы, мастацкая дэталь, паэтычны сінтаксіс. Лірызм, філасафічнасць празаічных твораў. Ідэйны змест апавядання «Асеннія лісты».

Мастацтва. Скульптура: А.Заспіцкі. Помнік Цётцы ў г. п. Астрына; А.Ліпень. Помнік Цётцы ў Шчучыне. Жывапіс: М.Купава. «Алаіза Пашкевіч (Цётка)»; І.Пратасеня. «Думы Цёткі»; Ф.Янушкевіч. «Роздум. А.Пашкевіч (Цётка)»; Л.Шчамялёў. «Родны край». Музыка: І.Лучанок. «Кася», «Як Лілея на Дунаі»; Ю.Семяняка. «Люблю мой сад...»; Д.Смольскі. «Арлы-брацці», «Вера беларуса», «Скрыпка».

Ядвігін Ш. Апавяданне «Дуб-дзядуля» (1 гадзіна). Звесткі пра жыццё і

творчасць. Увага да праблем чалавечага быцця, сэнсу і каштоўнасці чалавечага існавання. Філасофскі сэнс твора «Дуб-дзядуля». Лірызм і псіхалагізм апавядання. Прытчавая аснова. Адметнасць творчай манеры Ядвігіна Ш.

Мастацтва. Жывапіс: А. Крывенка. «Пісьменнік, грамадскі і палітычны дзеяч Ядвігін Ш. (Лявіцкі Антон Іванавіч)».

Янка Купала. Драма «Раскіданае гняздо» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). «Раскіданае гняздо». Сацыяльна-філасофскі, гуманістычны пафас і змест п’есы. Асноўныя сюжэтныя лініі. Жанравыя асаблівасці, кампазіцыя, развіццё канфлікту. Галоўныя героі, матывы іх паводзін. Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. Праўда Сымона і праўда Зоські. Вобраз Старца як выразніка народнай маралі. Вобраз Незнаёмага ў сістэме дзеючых асоб п’есы. Ідэйны сэнс Вялікага сходу. Рэалізм твора, сімвалічнасць яго назвы. Сцэнічнае ўвасабленне п’есы. Значэнне творчасці Янкі Купалы ў беларускай літаратуры.

Мастацтва. Скульптура: А.Анікейчык. Помнік Янку Купалу ў Ляўках; кампазіцыя «Малады Купала» ў Акопах (скульптары А.Заспіцкі і Г.Мурамцаў, архітэктар Ю.Казакоў). Жывапіс: Д.Полазаў. «Партрэт Янкі Купалы». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Раскіданае гняздо» (Нацыянальны дзяржаўны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага; рэжысёр Б.Луцэнка). Кінамастацтва: «Раскіданае гняздо» (рэжысёр Б.Луцэнка).

Якуб Колас. Трылогія «На ростанях» (частка першая «У палескай глушы»); паэма «Сымон-музыка» (7 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Трылогія «На ростанях». Гісторыя напісання і праблематыка, аўтабіяграфізм твора, яго сюжэтныя і кампазіцыйныя асаблівасці. Жанравая спецыфіка аповесці «У палескай глушы». Прататыпы галоўных герояў. Вобраз Андрэя Лабановіча – беларускага інтэлігента, шукальніка ісціны, сэнсу жыцця. Народ і інтэлігенцыя ў творы. Жаночыя вобразы. Майстэрства Коласа-празаіка: псіхалагізм, багацце мовы, мастацкая дэталізацыя. «Палескі каларыт» твора. Паэма «Сымон-музыка». Творчая гісторыя. Сістэма вобразаў. Праблема мастака і мастацтва ў творы. Адметнасць кампазіцыі. Устаўныя элементы, лірычныя адступленні і іх значэнне ў раскрыцці ідэйнага зместу твора. Роля прысвячэння. Месца і значэнне творчасці Якуба Коласа ў беларускай літаратуры.

Мастацтва. Жывапіс: Я.Кругер. «Партрэт Якуба Коласа». Музыка: І.Лучанок. «Роднаму краю»; У.Мулявін. «Каханне». Кінамастацтва: «Першыя выпрабаванні» (рэжысёр У.Корш-Саблін).

Максім Багдановіч. Вершы «Песняру», «Кніга», «Летапісец», «Мяжы», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...»; «Страцім-лебедзь» (4 гадзіны).

Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Погляды М.Багдановіча на прызначэнне паэта ў грамадстве. Зварот да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі. Скіраванасць да агульначалавечай праблематыкі. Багацце духоўнага свету лірычнага героя. Рытмічная разнастайнасць і меладычнасць верша. Сувязь творчасці М.Багдановіча з класічнай спадчынай і сусветнай паэзіяй. «Страцім-лебедзь». Сінтэтычнасць жанру. Паэтычная інтэрпрэтацыя сюжэта пра Сусветны патоп. Сімвалічны вобраз Страцім-лебедзя. Гармонія зместу і формы ў творы.

Тэорыя літаратуры. Верлібр.

Мастацтва. Скульптура: Л.Гумілеўскі. «Максім Багдановіч»; В.Янушкевіч. «Зорка Максіма Багдановіча» (бронза). Жывапіс: І.Рэй. «Шлях паэта». Музыка: песні і рамансы на словы паэта (кампазітары Л.Абіліёвіч, М.Аладаў, А.Багатыроў, У.Мулявін, І.Палівода, А.Туранкоў, Э.Тырманд).

Алесь Гарун. Вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады» (1 гадзіна). Звесткі пра жыццё і творчасць. Вызваленча-патрыятычныя матывы, агульначалавечыя каштоўнасці ў вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...». Абвостранае пачуццё любові да радзімы. Праблемы сэнсу жыцця, прызначэння чалавека («Ідуць гады»).

Беларуская літаратура 1920-х – 1930-х гадоў: агляд (1 гадзіна). Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і культурнага будаўніцтва ў 1920-я гады. Літаратурныя аб’яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАПП, іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчыя здабыткі і пошукі ў літаратуры 1920-х гадоў і іх спад у 1930-я гады пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця і тэорыі бесканфліктнасці. Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гады.

Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (Уладзімір Жылка, Максім Танк, Міхась Машара, Валянцін Таўлай, Міхась Васілёк і іншыя пісьменнікі) (1 гадзіна).

Мастацтва. Скульптура: А.Грубэ. «Трактарыстка», «Беларус»; А.Арлоў. «Пагранічнік і калгасніца». Жывапіс: І.Ахрэмчык. «Падпісанне Маніфеста аб утварэнні БССР»; М.Філіповіч. «На Купалле», «Стары беларус з люлькай»; В.Бялыніцкі-Біруля. «Пачатак вясны». Музыка: опера «У пушчах Палесся» А.Багатырова.

Максім Гарэцкі. Апавяданне «Літоўскі хутарок»; аповесць «Дзве душы» (4 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). «Літоўскі хутарок». Аўтабіяграфічнасць апавядання. Трагізм лёсу герояў. Антываенная скіраванасць твора. Чалавек і абставіны ў творы. «Дзве душы». Глыбокі аналіз рэчаіснасці ў спалучэнні з раскрыццём унутранага свету асобы. Вобраз Ігната Абдзіраловіча. Ігнат Абдзіраловіч і Васіль: шляхі ўзаемадзеяння. Героі-адраджэнцы: Ірына Сакавічанка,

Мікола Канцавы, Сухавей. Адсутнасць маральных арыенціраў у Гаршка і Гарэліка. Жанравыя адметнасці аповесці.

Тэорыя літаратуры. Аўтабіяграфізм і дакументалізм у літаратуры.

Мастацтва. Скульптура: М.Рыжанкоў. Помнік М.Гарэцкаму ў Мінску. Кінамастацтва: «Максім Гарэцкі. Прысады жыцця» (рэжысёр І.Калоўскі).

Змітрок Бядуля. Абразкі, лірычныя мініяцюры «Плач пралескаў», «Нібы рупны араты...»; апавяданне «Бондар» (2 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Абразкі і лірычныя мініяцюры. Рамантычная настраёвасць твораў, захапленне прыгажосцю роднага краю, спалучаныя з рэалістычным адлюстраваннем жыцця. Лірычны герой-рамантык – асоба ўзвышаная, духоўна багатая. Пошукі сэнсу жыцця, адказаў на пытанні пра прызначэнне чалавека; паяднанасць чалавека з прыродай, роднай зямлёй. Асаблівасці жанру: вобразная асацыятыўнасць, метафарычнасць, адметнасці формы, рытміка-інтанацыйнага ладу. «Бондар». Асэнсаванне праблемы мастака і мастацтва. Вобраз майстра-працаўніка. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора: сцісласць, драматызм, псіхалагізм.

Уладзімір Дубоўка. Вершы «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца...», «Родная мова, цудоўная мова!», «Цягнік спяшаўся» (1 гадзіна). Звесткі пра жыццё і творчасць. Асноўныя матывы лірыкі. Паэтызацыя красы прыроды, кахання. Высокая культура верша, лірызм, асацыятыўная вобразнасць, багацце жанравых форм. Традыцыі фальклору ў лірыцы, уздзеянне паэзіі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча на творчасць У.Дубоўкі.

Тэорыя літаратуры. Паэтычныя тропы (паглыбленне паняцця). Метанімія, сінекдаха, гіпербала, эўфемізм.

Мастацтва. Музыка: М.Шчаглоў-Кулікович. «О Беларусь, мая шыпшына»; М.Равенскі. «На прасторах сініх», «Ліпнёвы гімн». Жывапіс: П.Драчоў. Ілюстрацыі да выдання (Дубоўка, У. Выбраныя творы: у 2 т. – Мінск, 1965).

Гіём Апалінэр. Вершы «Мост Мірабо», «Цень» (1 гадзіна). Ідэйна-эстэтычныя пошукі паэта. Спецыфіка адлюстравання пачуццяў чалавека ў паэзіі Гіёма Апалінэра. Крызіс гуманізму пасля Першай сусветнай вайны.

Уладзімір Жылка. Вершы «Меч», «Палімпсест», «Мы любім дзіўныя паданні», «Беларусь», «Максім Багдановіч» (2 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Традыцыі еўрапейскага рамантызму ў паэзіі Уладзіміра Жылкі. Грамадзянскія і патрыятычныя матывы лірыкі. Карціны гістарычнага мінулага і заклік да абуджэння народа. Вобраз лірычнага героя – рамантыка-максімаліста, змагара за свабоду Радзімы. Сімволіка твораў. Арыентацыя паэзіі Уладзіміра Жылкі на традыцыі філасофскай лірыкі Максіма Багдановіча. Багацце і дасканаласць жанравых форм.

Язэп Пушча. Вершы «Раніцу шчэбет пільнуе...», «Светлых дзён

хараство», «Каплі вады», «Лісты да сабакі», «Лета» (2 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Агульная ідэйна-пафасная эвалюцыя лірыкі паэта: ад радаснага захаплення жыццём да адчування трагічнага надлому, ураўнаважана-светлага адчування прыгажосці, пошуку гармоніі рэчаіснасці. Язэп Пушча – майстар пейзажнай лірыкі. Тэма паэта і паэзіі і яе інтэрпрэтацыя. Сімволіка і яе змест у творчасці паэта.

Кандрат Крапіва. Байкі «Дзед і баба», «Саманадзейны конь»; камедыя «Хто смяецца апошнім» (4 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Байкі. Выкрыццё бескультур’я, амаральнасці, некампетэнтнасці, бяздушнага стаўлення да сумленных працаўнікоў, высмейванне самаўпэўненасці, нахабства, падхалімства і іншых чалавечых заган.

«Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Канфлікт у п’есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Сатырычная камедыя. Канфлікт у драматычным творы.

Мастацтва. Кінамастацтва: «Кандрат Крапіва» (рэжысёр М.Купеева); «Загадкі дзеда Кандрата» (рэжысёр А.Леўчык); «Хто смяецца апошнім» (рэжысёр У.Корш-Саблін). Жывапіс: А.Александровіч. Ілюстрацыі да баек.

Андрэй Мрый. Раман «Запіскі Самсона Самасуя» (2 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Раман «Запіскі Самсона Самасуя» – твор пра анамаліі грамадскага жыцця сярэдзіны 1920-х гадоў. Рэальная аснова твора. Увасабленне тыповых рыс кар’ерызму, эгаізму, бюракратызму, падхалімства, прыстасавальніцтва. Сатырыка-гумарыстычныя сродкі выкрыцця самасуеўшчыны.

Тэорыя літаратуры. Сатырычны раман.

Мастацтва. Кінамастацтва: тэлефільм «Пратарчака жыцця, або Запіскі Самсона Самасуя» (рэжысёр У.Арлоў).

Міхась Зарэцкі. Апавяданні «Дзіўная», «Кветка пажоўклая» (2 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Адлюстраванне складанага працэсу нараджэння новага ў жыцці, фарміравання людзей з новым светапоглядам у апавяданні «Дзіўная». Драматызм лёсу Шумавай. Маральная праблематыка, асэнсаванне вечнага і часовага ў творы. «Кветка пажоўклая». Паказ маральнай дэградацыі Марыны Гарновай. Трагічны фінал апавядання. Псіхалагізм, вастрыня канфлікту ў творы. М.Зарэцкі – майстар вострага сюжэта, мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

Тэорыя літаратуры. Псіхалагізм у мастацкім творы (паглыбленне паняцця).

Стэфан Цвейг. Навела «Нябачная калекцыя» (1 гадзіна). Творчая спадчына сусветна вядомага аўстрыйскага пісьменніка. Стэфан Цвейг – навеліст. Рэалістычныя традыцыі ў навеле «Нябачная калекцыя». Адлюстраванне жорсткіх жыццёвых рэалій і высокага мастацтва. Праблема сапраўдных і ўяўных каштоўнасцей. «Выратавальны падман» героя-апавядальніка. Псіхалагізм у абмалёўцы герояў твора.

Тэорыя літаратуры. Навела (паглыбленне паняцця).

Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945). Агляд (1 гадзіна). Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай літаратуры. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, уславўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Адметнасць творчасці беларускіх пісьменнікаў у гады вайны: перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры. Пісьменнікі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны: А.Куляшоў, П.Панчанка, Я.Брыль, К.Кірэенка, А.Вялюгін, М.Аўрамчык, А.Астрэйка, А.Бялевіч, У.Карпаў, М.Сурначоў і іншыя аўтары. Патрыятычная публіцыстыка.

Мастацтва. Скульптура: М.Кандрацьеў. «Загінуўшых чакаюць вечна (удовы вайны)». Жывапіс: В.Грамыка. «Балада пра ваенную маладосць»; М.Савіцкі. «Партызанская мадонна»; М.Тарасікаў. «Брацкія магілы». Музыка: І.Лучанок. «Ёсць у горада слава гордая» (словы А.Вярцінскага).

Гераіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі (5 гадзін).

Пятрусь Броўка. Вершы «Спатканне» («Мне ўсё дорага тут...»), «Родны край». Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Лірыка. Агляд творчасці П.Броўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Патрыятычны і грамадзянскі пафас твораў паэта. Выяўленне палымянай веры ў перамогу.

Мастацтва. Музыка: У.Мулявін. Песня «Александрына» (словы П.Броўкі). Жывапіс: У.Гардзеенка. «Думы пра былое (П.Броўка)»; С.Герус. «Партрэт Петруся Броўкі»; І.Пратасеня. «Партрэт П.Броўкі».

Аркадзь Куляшоў. Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Ваенная лірыка А. Куляшова. Суровая праўда ў паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай». «Сцяг брыгады». Адлюстраванне падзей пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў творы. Мастацкае ўвасабленне тэмы вернасці воінскаму сцягу. Вобразы Алеся Рыбкі, Мікіты Ворчака і камісара Заруднага. Патрыятычны пафас твора. Жанравая і стылявая адметнасць паэмы.

Максім Танк. Вершы «Родная мова», «Рэквіем». Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы беларускага народа.

Кузьма Чорны. Апавяданне «Макаркавых Волька»; раман «Пошукі будучыні» (5 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). «Макаркавых Волька». Канкрэтна-гістарычны змест твора. Адлюстраванне характэрнай для 1930-х гадоў атмасферы падазронасці, недаверу. Супрацьпастаўленне гуманістычнай жыццёвай пазіцыі Волькі і агіднай паклёпніцкай пазіцыі Сафрона Дзядзюлі. Асуджэнне ў апавяданні праяў шальмавання і прыніжэння чалавечай годнасці. Пазачасавае значэнне праблем, узнятых у творы.

«Пошукі будучыні» – буйны эпічны твор часоў вайны. Сацыяльна-філасофскі змест рамана. Асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твора. Драматычны лёс ахвяр Першай і Другой сусветных войнаў. Аўтарская канцэпцыя будучыні беларускага народа. Няздзейсненыя мары старэйшага пакалення (Нявады, Сымона Ракуцькі). Тэма «скрадзенага дзяцінства». Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Асуджэнне авантурысцкіх планаў графа Паліводскага і Густава Шрэдэра – новых прэтэндэнтаў на панаванне ва ўмовах акупацыі. Антываенны пафас рамана. Кузьма Чорны – майстар мастацкай дэталі, партрэтнай і моўнай характарыстыкі, пейзажнай і бытавой замалёўкі, разгалінаванага сюжэта. Стылявыя адметнасці творчасці і псіхалагізм у прозе Кузьмы Чорнага.

Тэорыя літаратуры. Жанр рамана (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: З.Азгур. «Пісьменнік Кузьма Чорны». Жывапіс: І.Ахрэмчык. «Партрэт К.Чорнага».

Андрэ Маруа. Навела «Пакаранне золатам» (1 гадзіна). Паказ згубнай улады золата ў навеле. Трагікамічнае становішча багатага ранцье Борака і яго жонкі, запалоханых магчымасцю страціць свой капітал. Псіхалагічная матывіроўка паводзін герояў навелы.

Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965) (1 гадзіна). Патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Тэмы вайны і адраджэння мірнага жыцця як цэнтральныя ў літаратуры. Вяртанне да класічных традыцый рэалістычнага мастацтва (проза І.Мележа, В.Быкава, Я.Брыля, А.Кулакоўскага, паэзія А.Вялюгіна, А.Пысіна, М.Аўрамчыка, К.Кірэенкі, А.Вярцінскага, драматургія К.Губарэвіча, А.Макаёнка).

Здабыткі ў жанры паэмы (6 гадзін).

Максім Танк. Паэма «Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Спалучэнне эпічнага і лірычнага пачаткаў у творы. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме. Тыпалагічная блізкасць героя паэмы Максіма Танка да купалаўскага Гусляра.

Пятрусь Броўка. Паэма «Голас сэрца». Матывы сыноўняга болю і бяды ў паэме. Спалучэнне лірычнага і публіцыстычнага пачаткаў. Вобраз маці-паланянкі. Антываенны і гуманістычны пафас твора.

Аркадзь Куляшоў. Паэма «Маналог». Матывы памяці, вернасці сяброўству, ідэалам маладосці.

Пімен Панчанка. Вершы «Герой», «Толькі лісцем рабін шалахні...», «Родная мова», «Спарышы», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Крык сойкі», «Мала сказаць: ненавіджу...» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Патрыятычны пафас ваеннай паэзіі П.Панчанкі. Гераічнае і трагічнае ў вершы «Герой». Роздум пра лёс нацыянальнай мовы, сэнс жыцця, адносіны паміж людзьмі і наваколлем. Спавядальны характар, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця. Публіцыстычная завостранасць твораў, разнастайнасць рытміка-інтанацыйнага малюнка, багацце сродкаў мастацкага выяўлення.

Мастацтва. Музыка: В.Іваноў. «Тапаліны звон» (словы Пімена Панчанкі). Жывапіс: Я.Батальёнак. «Далягляды»; М.Будавей. «Партрэт Пімена Панчанкі»; С.Каткоў. «На Бярэзіне»; В.Шкаруба. «Світанак».

Іван Мележ. Раманы «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» (6 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць. «Людзі на балоце», «Подых навальніцы». Творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка «Палескай хронікі». Жанрава-кампазіцыйная цэласнасць твора. Нацыянальныя характары ў рамане. Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў – Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі. Настойлівае імкненне Васіля да самасцвярджэння і незалежнасці, яго сціпласць, цярплівасць, працавітасць, разгубленасць у складаных жыццёвых абставінах. Драматычны лёс Ганны. Нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян. Драматызм становішча Глушака ў час калектывізацыі. Вобразы Апейкі, Башлыкова, Харчава, Міканора. Чалавек і прырода ў творы. Паэтызацыя сялянскай працы. Псіхалагічнае майстэрства Мележа-празаіка. Роля ўнутранага маналогу, няўласна-простай мовы, мовы герояў (палескага дыялекту) у раскрыцці характараў. Нацыянальная самабытнасць творчасці Івана Мележа і яе агульначалавечая значнасць.

Мастацтва. Жывапіс: Г. Вашчанка. «Маё Палессе»; А. Гараўскі. «Пінскія балоты»; Ю.Зайцаў. «Людзі Палесся»; Н.Шчасная. «Партрэт Івана Мележа». Выяўленчае мастацтва: Л.Талбузін. Медаль «Іван Мележ». Кінамастацтва: кінафільм «Людзі на балоце» (рэжысёр В.Тураў); тэлеспектакль «Завеі, снежань...» (рэжысёр У.Забэла).

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна)

Спіс твораў для завучвання на памяць

Алесь Гарун. «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...».
Максім Багдановіч. «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...».
Уладзімір Дубоўка. «Родная мова, цудоўная мова...».

Пімен Панчанка. «Герой».

Іван Мележ. Урывак з рамана «Людзі на балоце» (ад слоў «Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна...» і да слоў «...так і відаць – маладосць, сіла ў кожнай жылачцы!»).

Спіс твораў для дадатковага чытання

Максім Гарэцкі. «На імперыялістычнай вайне».
Анатоль Грачанікаў. Зборнік «Палессе».
Леанід Дайнека. «След ваўкалака».
Вацлаў Ластоўскі. «Князёўна Рагнеда», «Усяслаў», «Вітаўт і Ягайла».
Уладзімір Дубоўка. Пераклады санетаў У.Шэкспіра.
Уладзімір Жылка. «Хараство», «Няма збавення».
Міхась Зарэцкі. «Вязьмо».
Зборнік «Іскры Вечнага агню» (уклад. А. Васілевіч і іншыя аўтары).
Лукаш Калюга. Апавяданні.
Казімір Камейша. 2-3 вершы са зборніка «Курганны звон» (з серыі «Дзеці вайны»).
Тодар Кляшторны. Вершы са зборніка «Кляновыя завеі».
Якуб Колас. «У глыбі Палесся», «На ростанях» (2-я і 3-я кнігі трылогіі «На ростанях»).
Шарль дэ Кастэр. «Легенда пра Ціля Уленшпігеля».
Кандрат Крапіва.»Мілы чалавек».
Міхась Лынькоў. Апавяданні.
Алесь Марціновіч. Зборнік «Хто мы, адкуль мы...».
Міхась Пазнякоў. «Хлеб для партызанаў».
Сімяон Полацкі. «Пралог да прападобнай маці Ефрасінні».
Язэп Пушча. Вершы са зборніка «Дні вясны».
Райнер Марыя Рыльке. «Паэт», «Сёмая элегія».
Уільям Фолкнер. «Пах вербены».
Эрнэст Хэмінгуэй. «Бывай, зброя!».
Мікалай Чаргінец. «Вам – заданне» (пераклад А. Марціновіча).
Міхась Чарот. Вершы.
Ян Чачот. «Наваградскі замак».
Кузьма Чорны. «Зямля».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў X класа

Ведаць:
аўтараў, назвы і змест праграмных твораў;
этапы развіцця беларускай літаратуры;
асноўныя эпохі і напрамкі развіцця літаратуры;

асноўныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў;

выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;

звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;

творы для завучвання на памяць;

умець:

выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурны твор з улікам родавых, жанравых і стылявых адметнасцей на аснове самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі;

вызначаць тэматыку, праблематыку літаратурнага твора;

характарызаваць літаратурнага героя;

аналізаваць прыёмы раскрыцця характару ў мастацкім творы;

выяўляць аўтарскую пазіцыю;

выяўляць асноўныя адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;

аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкі твор, выкарыстоўваючы звесткі па гісторыі і тэорыі літаратуры;

самастойна ацэньваць вывучаныя творы з улікам іх мастацкай спецыфікі і абгрунтоўваць гэту ацэнку;

суадносіць мастацкую літаратуру з грамадскім і культурным жыццём, раскрываць канкрэтна-гістарычны і агульначалавечы змест вывучаных літаратурных твораў;

весці дыялог па прачытаных творах, улічваць чужы пункт гледжання на твор і аргументавана адстойваць сваё меркаванне;

рыхтаваць разгорнуты адказ на праблемнае пытанне;

даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і на творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;

самастойна пісаць сачыненне на прапанаваную тэму;

рыхтаваць паведамленне, рэферат і іншыя віды работ;

складаць план і канспект літаратурна-крытычнага артыкула;

карыстацца рознага роду даведачна-інфармацыйнымі крыніцамі;

валодаць:

гісторыка- і тэарэтыка-літаратурнымі ведамі як інструментам паглыбленага аналізу мастацкага твора;

навыкамі абагульнення, сістэматызацыі і супастаўлення вывучанага, выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі музыкі, жывапісу, скульптуры, тэатра, тэле- і кінамастацтва;

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, даклада, рэферата, водгуку, рэцэнзіі);

навыкамі работы з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (літаратурна-крытычныя артыкулы, слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы);

вопытам мастацка-творчага характару (мастацкія замалёўкі, апавяданні, нарысы, эсэ, вершы).

XI клас

Усяго 102 гадзіны:
на вывучэнне твораў – 87 гадзін;
на навучальныя сачыненні – 4 гадзіны;
на кантрольнае сачыненне – 8 гадзін;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 2 гадзіны;
рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1960-х – ПАЧАТКУ 1990-х ГАДОЎ (67 гадзін)

Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х – пачатку 1990-х гадоў. Агляд (2 гадзіны). Літаратура ва ўмовах новай грамадскай сітуацыі. Значнасць гісторыка-сацыяльных пераўтварэнняў. Пашырэнне сферы мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Антываенны пафас творчасці пісьменнікаў філалагічнага пакалення.

Узбагачэнне светабачання беларускіх паэтаў, іх жанравыя і стылявыя пошукі (Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Янішчыц, Ніна Мацяш, Раіса Баравікова, Генадзь Пашкоў, Казімір Камейша, Васіль Зуёнак, Раіса Баравікова, Пятрусь Макаль і іншыя паэты). Грамадзянскасць і маральна-этычная скіраванасць пафасу паэтычнай творчасці. Павышаная цікавасць да філасофскіх праблем, складаных пытанняў чалавечага жыцця.

Тэматыка, праблематыка і жанравая разнастайнасць беларускай прозы (Васіль Быкаў, Іван Мележ, Уладзімір Караткевіч, Іван Навуменка, Міхась Стральцоў, Віктар Казько, Вячаслаў Адамчык, Іван Пташнікаў, Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Іван Шамякін, Віктар Карамазаў, Янка Сіпакоў, Алесь Жук, Георгій Марчук, Генрых Далідовіч і іншыя мастакі слова).

Здабыткі ў жанрах драмы і камедыі (п’есы Андрэя Макаёнка, Уладзіміра Караткевіча, Міколы Матукоўскага, Аляксея Дударава, Георгія Марчука, Анатоля Дзялендзіка і іншых драматургаў). Праблемнасць, канфліктная аснова твораў беларускіх драматургаў.

Іван Шамякін. Аповесць «Гандлярка і паэт»; раман «Сэрца на далоні»

(8 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага).

«Гандлярка і паэт». Гісторыя напісання аповесці. Тэма трагічнага лёсу жанчыны на вайне. Вобраз Вольгі Ляновіч. Каханне ў лёсе гераіні. Вобраз Алеся Шпака, яго роля ў духоўным узвышэнні Вольгі Ляновіч. Праблема маральнага выбару ў творы. Майстэрства пісьменніка ў стварэнні сюжэта, псіхалагічнай абмалёўцы характараў.

«Сэрца на далоні». Праблематыка рамана. Маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Вастрыня канфлікту. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз кар'ерыста Гукана. Вобраз Зосі Савіч, яе жыццёвы лёс. Маладое пакаленне ў рамане. Няўстойлівасць жыццёвай пазіцыі Славіка Шыковіча. Складаны шлях духоўнага станаўлення Тараса. Праблема ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, неабходнасць выхавання маладога пакалення. Сімволіка назвы твора. Значэнне творчасці Івана Шамякіна для развіцця беларускай літаратуры.

Мастацтва <2>. Жывапіс: М.Будавей. «Партрэт Івана Шамякіна»; Н.Шчасная. «Снежныя зімы (партрэт пісьменніка Шамякіна)»; У.Масленікаў. «Мае бацькі ў маі 1945 года». Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Трывожнае шчасце», «Сэрца на далоні», «І змоўклі птушкі» (па творах І.Шамякіна). Кінамастацтва: мастацкія фільмы «Гандлярка і паэт» (рэжысёр С.Самсонаў), «Вазьму твой боль» (рэжысёр М.Пташук).

--------------------------------

<2> Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва» адбываецца на выбар педагагічнага работніка і, у першую чаргу, з апорай на вядомае. Яны выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, дадатковыя гадзіны на авалоданне імі не патрабуюцца.

Андрэй Макаёнак. «Зацюканы апостал» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць драматурга. «Зацюканы апостал». Жанравая адметнасць п'есы. Спалучэнне ў творы камічнага і трагічнага. Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны змест камедыі, сцвярджэнне аўтарам духоўных агульначалавечых каштоўнасцей. Майстэрства А.Макаёнка ў абмалёўцы характараў.

Тэорыя літаратуры. Жанр трагікамедыі (пачатковае паняцце). Моўная характарыстыка персанажаў (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: М.Будавей. «А.Макаёнак». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Зацюканы апостал» (рэжысёр Б.Луцэнка).

Янка Брыль. Апавяданне «Галя»; лірычныя мініяцюры «Загадка», «Трохі пра вечнае» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). «Галя». Пошукі чалавечага шчасця і

сэнсу жыцця. Гісторыя кахання гераіні. Праблема маральнага выбару і адказнасці чалавека за свае ўчынкі. Спалучэнне лірычнай усхваляванасці з глыбокім пранікненнем у псіхалогію чалавека. Асаблівасці кампазіцыі апавядання. Лірычныя мініяцюры. Паэзія «імгненняў жыцця». Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў «малой прозе». Ідэя разнастайнасці жыцця і яго праяў у творчасці.

Тэорыя літаратуры. Лірычная проза (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: М.Будавей. «Партрэт Я.Брыля».

Васіль Быкаў. Аповесці «Сотнікаў», «Абеліск», «Знак бяды» (10 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць. «Сотнікаў». Праблематыка аповесці. Чалавек перад знішчальнай сілай абставін. Вобразы Сотнікава і Рыбака ў творы. Праблема выбару на вайне. Персанажы другога плана ў аповесці (стараста, Дзёмчыха, Бася), іх мужнасць. Выкрыццё паліцэйскіх – прыслужнікаў немцаў – у творы (Партноў, Стась Гаманюк, Будзіла). Мастацкая дасканаласць твора. Яго сюжэт і кампазіцыя. Пейзаж у аповесці. Роля мастацкай дэталі ў абмалёўцы герояў і падзей. «Абеліск». Ідэйна-мастацкае вырашэнне ў аповесці праблемы гераічнага. Вобраз Мароза як увасабленне ідэалу настаўніка і носьбіта духоўных асноў народа. Асаблівасці кампазіцыйнай будовы твора. Сімвалічны сэнс яго назвы.

«Знак бяды». Актуальнасць маральна-філасофскай праблематыкі аповесці. Вастрыня трагедыйнага канфлікту. Маштабнасць характараў галоўных герояў – Петрака і Сцепаніды. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Глыбокі псіхалагізм аповесці. Мастацкая сімволіка твора. Значэнне творчасці Васіля Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Вобраз-сімвал (пачатковае паняцце). Мастацкая дэталь (паглыбленне паняцця). Гераічнае і трагічнае ў літаратуры.

Мастацтва. Жывапіс: М.Будавей. «Партрэт В.Быкава»; М.Данцыг. «Партрэт В.Быкава»; А.Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да аповесцей В.Быкава «Пайсці і не вярнуцца», «Яго батальён»; Г.Паплаўскі. Ілюстрацыі да аповесцей В.Быкава «Дажыць да світання», «Сотнікаў»; У.Тоўсцік. «Васілю Уладзіміравічу Быкаву прысвячаецца»; «Васілёва зорка»: альбом. Кінамастацтва: «Абеліск» (рэжысёр Р.Віктараў), «Знак бяды» (рэжысёр М.Пташук), «Узыходжанне» (рэжысёр Л.Шэпіцька).

Эрнэст Хемінгуэй. Аповесць «Стары і мора» (2 гадзіны). «Стары і мора». Праблемы жыцця і смерці, прыроды і чалавека, пераемнасці пакаленняў. Вобраз галоўнага героя аповесці. Падтэкст у творы.

Уладзімір Караткевіч. Вершы «Каложа», «Багдановічу», «Ты і я», «І тады закахалася хмара...»; раман «Чорны замак Альшанскі» (7 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага). Лірыка. Тэма Бацькаўшчыны, яе гістарычнага мінулага і будучыні. Патрыятычны пафас, спалучаны з глыбокім лірызмам. Паэтызацыя прыроды і прыгажосці

кахання. Сувязь лірыкі з традыцыямі фальклору. Асацыятыўная вобразнасць, жанравая разнастайнасць.

«Чорны замак Альшанскі». Праблематыка твора. Гісторыя і сучаснасць у рамане. Антон Косміч як носьбіт ідэй гуманнасці і патрыятызму. Розныя тыпы герояў. Адлюстраванне непераможнасці дабра і чалавечнасці. Мастацкія асаблівасці твора. Рэтраспектыўны спосаб адлюстравання рэчаіснасці.

Тэорыя літаратуры. Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў літаратуры (паглыбленне паняццяў). Гістарычны раман.

Мастацтва. Музыка: Я.Глебаў. Раманс «Любы мой»; Л.Мурашка. Раманс «Дагарэў за брамай небакрай»; Д.Смольскі. Опера «Сівая легенда». Скульптура: С.Вакар. «Пісьменнік У.Караткевіч». Жывапіс: Л.Дударэнка. «Беларускія пісьменнікі Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Ніл Гілевіч». Кіна- і тэлемастацтва: тэлеспектакль «Лісце каштанаў»; фільмы: «Будзь шчаслівa, рака» (сцэнарыст У.Караткевіч), «Быў, ёсць, буду» (сцэнарыст і рэжысёр Ю.Цвяткоў), «Кніганошы» (рэжысёр У.Траццянкоў), «Ладдзя роспачы» (рэжысёр Л.Тарасаў), «Лісце каштанаў» (рэжысёр У.Забэла), «Маці ўрагану» (рэжысёр Ю.Марухін).

Міхась Стральцоў. Апавяданні «Сена на асфальце», «На чацвёртым годзе вайны», «Смаленне вепрука» (5 гадзін). Звесткі пра жыццё і творчасць. «Сена на асфальце». Тэматыка, ідэйны пафас. Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты. Вобраз аўтара-апавядальніка і іншых герояў твора. Адметнасць кампазіцыі. Лірызм стылю. Прырода ў творы. «На чацвёртым годзе вайны». Гора і нястачы, прынесеныя ў сялянскую сям'ю вайной, якую кожны з сямейнікаў перажывае па-свойму. Вобразы старой маці, нявесткі Марусі і яе маленькага сына. Заўчаснае сталенне хлопчыка, яго рашучае жаданне дапамагчы маці і бабулі, узяць на сябе адказнасць за лёс сям'і. Глыбокі псіхалагізм у паказе характараў. «Смаленне вепрука». Адметнасць кампазіцыі апавядання. Роля мастацкай дэталі ў творы. Наватарства аўтарскага індывідуальнага стылю.

Тэорыя літаратуры. Унутраны маналог як сродак раскрыцця характараў герояў.

Ніл Гілевіч. Вершы «Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...», «Паклон табе, мой беларускі краю!..»; раман у вершах «Родныя дзеці» (4 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. Лірыка. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны, паэтызацыя прыроды – асноўныя тэмы паэзіі Н. Гілевіча. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў лірыцы паэта.

«Родныя дзеці». Праблематыка твора. Вобраз галоўнага героя Сцяпана Вячоркі. Другарадныя вобразы і іх роля ў творы. Сюжэтна-кампазіцыйная

структура. Лірыка-публіцыстычны стыль рамана, значэнне лірычных адступленняў.

Тэорыя літаратуры. Раман у вершах.

Мастацтва. Жывапіс: М.Андруковіч. «Лагойскі краявід»; М.Бушчык «Відная ноч». Графіка: А.Лапіцкая. «Гучаць над Палессем старажытныя песні». Музыка: Э. Зарыцкі. Песня «Палыновая ростань» (словы Н.Гілевіча); Л.Захлеўны. Песня «Сонца ў азерцы» (словы Н.Гілевіча); І.Лучанок. Песня «Я хаджу закаханы» (словы Н.Гілевіча);Э.Ханок. Песня «Вы шуміце, бярозы...» (словы Н.Гілевіча); «Аксамітавы вечар»: кампакт-дыск; «Нашы песні»: кампакт-дыск (ансамбль «Сябры»).

Іван Чыгрынаў. Апавяданні «Дзівак з Ганчарнай вуліцы», «У ціхім тумане» («Маці») (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. «Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Памяць мінулай вайны і лёс старога лесніка Дземідзёнка. Паэтызацыя гуманістычных каштоўнасцей, гармонія чалавека і прыроды. Вобраз героя-апавядальніка. «У ціхім тумане» («Маці»). Новыя падыходы да асэнсавання тэмы вайны. Узаемаадносіны ахвяр і здраднікаў. Праблема віны і даравання. Вобразы Рэйдзіхі і Ганны. Гуманістычны пафас апавядання.

Мастацтва. Жывапіс: В.Грамыка. «Па-над Прыпяццю. 1941 год»; А.Малішэўскі. «Мы вернемся»; І.Белановіч. «Сустрэча з недалёкім мінулым».

Іван Навуменка. Апавяданні «Сямнаццатай вясной», «Хлопцы самай вялікай вайны» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць. «Сямнаццатай вясной». Паказ лёсу моладзі ў гады вайны з фашызмам. Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Эмацыянальнасць зачыну апавядання, лірызм аповеда. Сімвалічнасць вобраза бэзу. «Хлопцы самай вялікай вайны». Жорсткая праўда жыцця. Унутраная самаацэнка юнакоў; жаночы, мацярынскі погляд на рэаліі вайны. Шматгранны партрэт пакалення. Роля мастацкай дэталі ў творы.

Тэорыя літаратуры. Сюжэт, элементы сюжэта (паглыбленне паняццяў).

Генрых Бёль. Раман «Дом без гаспадара» (ва ўрыўках) (2 гадзіны). «Дом без гаспадара». Адлюстраванне цяжкіх душэўных пакут пасляваеннага пакалення Германіі. Лёс удавы паэта Раймунда Баха Нэлы. Вобразы непераадоленага мінулага ў творы. Праблема бацькоў і дзяцей. Думкі аўтара пра ўсенародную віну за паўтарэнне фашызму. Раскрыццё псіхалогіі дзяцей-сірот у рамане (Марцін і Генрых). Вобраз мастака Альберта. Сэнс назвы рамана. Асаблівасці кампазіцыі. Прыёмы аўтарскага маналогу пры раскрыцці ўнутранага свету герояў.

Рыгор Барадулін. Вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў...», «Бацьку», «Заспаная раніца мжыстая...», «Чалавек не ўзнікае так...», «Пакуль жывеш, развітвайся з жыццём...» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Народнасць і самабытнасць паэзіі Рыгора

Барадуліна. Сувязь яго творчасці з традыцыямі фальклору, міфалогіі, класічнай літаратуры. Шчырасць, даверлівасць пачуццяў, псіхалагізм і экспрэсіўнасць у вершах. Асаблівасці паэтычнага майстэрства Рыгора Барадуліна: арыгінальная метафарычна-асацыятыўная вобразнасць, гукапіс, рытміка, рыфма.

Тэорыя літаратуры. Мастацкія тропы: метафара, сінекдаха, перыфраз (паглыбленне паняццяў).

Алесь Разанаў. Вершы «Радзіма...», «Кожны народ мае...», «У крузе», «Спадчына», «Горад», «На гэтай зямлі», «Барана» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці: суадносіны агульначалавечага (быційнага) і нацыянальна-гістарычнага (асабістага). Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта. Адметнасць творчай індывідуальнасці. Жанравыя і стылявыя асаблівасці лірыкі. Асацыятыўная вобразнасць. Роля А.Разанава ў развіцці сучаснай беларускай эксперыментальнай паэзіі.

Тэорыя літаратуры. Жанравыя пошукі сучаснай беларускай паэзіі: традыцыі і наватарства.

Георгій Марчук. Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці», «Канон Школе» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Жанравая і стылявая спецыфіка твораў, іх спавядальнасць. Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Глыбокае разуменне чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

Тэорыя літаратуры. Апавяданне і навела як эпічныя жанры (паглыбленне паняццяў). Жанр канона (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Кінамастацтва: фільм «Ліст да Феліні» (рэжысёр Д.Зайцаў).

Аляксей Дудараў. П’еса «Князь Вітаўт» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. «Князь Вітаўт». Наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага. Жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі. Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы. Маральна-этычнае завастрэнне канфлікту. Праблема асабістага шчасця ў п’есе. Сцвярджэнне ў творы галоўных каштоўнасцей на зямлі: любові, еднасці, згоды і міру.

Тэорыя літаратуры. Гістарычная драма.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектаклі «Князь Вітаўт» (рэжысёры В.Раеўскі, Б.Герлаван), «Радавыя» (рэжысёры В.Раеўскі, Б.Герлаван), «Чорная панна Нясвіжа» (рэжысёры В.Раеўскі, Б.Герлаван).

Міхась Башлакоў. Вершы «Дарогі Палесся», «Заркапад», «Рэха даўніх гадоў», «Не будзьце раўнадушнымі ніколі», «Тры лікі любові», «Музыка вясны», цыкл «Радзіма...» (3 гадзіны). Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. Свет Радзімы-Беларусі ў творчасці паэта, выяўленне пачуцця любові да зямлі бацькоў. Знітаванасць з родным краем як духоўная аснова ўнутранага свету лірычнага героя. Філасофскі роздум пра хуткаплыннасць часу і сэнс чалавечага жыцця. Задушэўнасць інтанацыі, меладычнасць,

тонкі лірызм вершаў.

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. АГЛЯД
(19 гадзін)

Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе (2 гадзіны). Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя. Беларускі постмадэрнізм: творчыя асобы і жанры. Літаратурна-мастацкая перыёдыка (часопісы «Полымя», «Маладосць» і іншыя выданні). Утварэнне і дзейнасць грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», яго супрацоўніцтва з пісьменнікамі іншых краін свету. Творчасць сучасных пісьменнікаў-землякоў.

Паэзія (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар педагагічнага работніка) (5 гадзін). Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і індывідуальна-асобаснага пачаткаў у творчасці Васіля Зуёнка, Анатоля Вярцінскага, Янкі Сіпакова, Юрася Свіркі, Дануты Бічэль, Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Раісы Баравіковай, Мар’яна Дуксы, Уладзіміра Карызны, Алеся Пісьмянкова, Міколы Маляўкі і іншых аўтараў. Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі: Алесь Бадак, Навум Гальпяровіч, Змітрок Марозаў, Мікола Мятліцкі, Мікола Шабовіч і іншыя паэты. Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі (Людміла Рублеўская, Віктар Шніп і іншыя мастакі слова).

Проза (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар педагагічнага работніка) (8 гадзін). Разнастайнасць тэматыкі і праблематыкі сучаснай прозы. Асэнсаванне пісьменнікамі стасункаў асобы і грамадства, повязі часоў і пакаленняў: Алесь Савіцкі «Пісьмо ў Рай»; Віктар Карамазаў «Крыж на зямлі і поўня ў небе»; навела Уладзіміра Сцяпана «Адна капейка» і іншыя творы. Далёкая і блізкая гісторыя ў сучаснай прозе: Леанід Дайнека. «Меч князя Вячкі»; Алесь Марціновіч «“Гетман-кларнет” на службе ў муз»; Іван Чыгрынаў. «Вяртанне да віны»; Іван Навуменка. «Вір»; Янка Сіпакоў. «Кулак» і іншыя творы.

Драматургія (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар педагагічнага работніка) (4 гадзіны). Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай драматургіі на сучасным этапе. Традыцыі драматургіі Кандрата Крапівы і Андрэя Макаёнка ў творчасці сучасных пісьменнікаў. Надзённасць маральна-этычнай праблематыкі ў творчасці Міколы Матукоўскага і іншых драматургаў. Узмацненне цікавасці да далёкага і блізкага мінулага ў творчасці Уладзіміра Бутрамеева і іншых аўтараў. Новыя мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі (І.Сідарук, А.Дзялендзік, П.Васючэнка і іншыя творцы). Сучасная

драматургія і тэатр.

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна).

Спіс твораў для завучвання на памяць

Міхась Стральцоў. Урывак з апавядання «Сена на асфальце» (пачынаючы са слоў «О зямля! Ты даеш нам тугу па небе...» і да слоў «...гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога»).

Ніл Гілевіч. Урывак з рамана ў вершах «Родныя дзеці» (з раздзела «Пашанаванне» ад слоў «Паклон табе ад сэрца, мама...» да слоў «І рукі ёй пацалаваў»).

Рыгор Барадулін. Верш «Чалавек не ўзнікае так...».

Верш з сучаснай беларускай паэзіі (на выбар вучняў).

Спіс твораў для дадатковага чытання

Паэзія

Зборнік «Краіну родную люблю».
Зборнік «Мая Радзіма».
Раіса Баравікова. Зборнік «Дрэва для райскай птушкі».
Міхась Башлакоў. Зборнік «Далеч вячэрняя».
Навум Гальпяровіч. Зборнік «Святло ў акне».
Сяргей Давідовіч. Паэмы «Партызанскі праспект», «Памяць».
Васіль Зуёнак. Зборнік «Лета трывожных дажджоў».
Анатоль Зэкаў. Зборнік «Белае сонца бяроз».
Казімір Камейша. Зборнік «Гордзіеў вузел».
Уладзімір Карызна. Зборнік «Доля – Русь наша Белая».
Пятро Макаль. Зборнік «Лагода».
Дзмітрый Марозаў. Зборнік «Вачыма сэрца».
Ніна Мацяш. Зборнік «Душою з небам гаварыць».
Мікола Мятліцкі. Зборнік «Прысутнасць».
Міхась Пазнякоў. Зборнік «Час надзеі».
Генадзь Пашкоў. Зборнік «У далонях свету».
Алесь Пісьмянкоў. Зборнік «Я не памру, пакуль люблю».
Людміла Рублеўская. Зборнік «Замак месячнага сяйва».
Віктар Шніп. Зборнік «Першы папяровы снег».

Проза

Зборнік «Мая Радзіма».
Янка Брыль. Зборнік «З людзьмі і сам-насам».

Васіль Быкаў. «У тумане», «Адна ноч».
Алесь Жук. «Душа над чыстым полем».
Віктар Карамазаў. «Зачараваная душа».
Алесь Марціновіч. «Цяпло колішніх вогнішчаў» (2-3 эсэ, гістарычныя аповесці на выбар педагагічнага работніка).
Георгій Марчук. «Давыд-гарадоцкія каноны» (2-3 навелы).
Іван Навуменка. «Любімы горад».
Іван Пташнікаў. «Мсціжы».
Іван Чыгрынаў. «Плач перапёлкі».
Іван Шамякін. «Злая зорка».

Драматургія

Аляксей Дудараў. «Радавыя».
Іван Чыгрынаў. «Следчая справа Вашчылы».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў XI класа

Ведаць:
аўтараў, назвы і змест праграмных твораў;
этапы развіцця беларускай літаратуры;
асноўныя эпохі і напрамкі развіцця літаратуры;
асноўныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў;
выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;
звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;
творы для завучвання на памяць;
умець:
выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурны твор з улікам родавых, жанравых і стылявых адметнасцей на аснове самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі;
вызначаць тэматыку, праблематыку літаратурнага твора;
характарызаваць літаратурнага героя;
аналізаваць прыёмы раскрыцця характару ў мастацкім творы;
выяўляць аўтарскую пазіцыю;
выяўляць асноўныя адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;
аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкі твор, выкарыстоўваючы звесткі па гісторыі і тэорыі літаратуры;
самастойна ацэньваць вывучаныя творы з улікам іх мастацкай спецыфікі і абгрунтоўваць гэту ацэнку;
суадносіць мастацкую літаратуру з грамадскім і культурным жыццём, раскрываць канкрэтна-гістарычны і агульначалавечы змест вывучаных

літаратурных твораў;

весці дыялог па прачытаных творах, улічваць чужы пункт гледжання на твор і аргументавана адстойваць сваё меркаванне;

рыхтаваць разгорнуты адказ на праблемнае пытанне;

даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і на творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;

самастойна пісаць сачыненне на прапанаваную тэму;

рыхтаваць паведамленне, рэферат і іншыя віды творчай дзейнасці;

складаць план і канспект літаратурна-крытычнага артыкула;

карыстацца рознага роду даведачна-інфармацыйнымі крыніцамі;

валодаць:

гісторыка- і тэарэтыка-літаратурнымі ведамі як інструментам паглыбленага аналізу мастацкага твора;

навыкамі абагульнення, сістэматызацыі і супастаўлення вывучанага, выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі музыкі, жывапісу, скульптуры, тэатра, тэле- і кінамастацтва;

living

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, даклада, рэферата, водгуку, рэцэнзіі);

навыкамі работы з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (літаратурна-крытычныя артыкулы, слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы);

вопытам мастацка-творчага характару (мастацкія замалёўкі, апавяданні, нарысы, эсэ, вершы).